ЗАДАННІ НА РАЗВІЦЦЁ ЧЫТАЦКАЙ ГРАМАТНАСЦІ

Прачытайце тэкст івыканайце заданні да яго.

Тэкст1

Пасля таго як у другой палове 19 стагоддзя  побач з коннымі экіпажамі на дарогах гарадоў з’явіліся першыя аўтамабілі, узнікла неабходнасць уладкаваць рух транспартных сродкаў – надзвычай разнастайнымі  былі іх хуткасць і мабільнасць.

Самы першы аўтаматычны святлафор семафорнага тыпу быў усталяваны ў Лондане на плошчы перад Парламентам у снежні 1868 года інжынерам-механікам Дж. П. Найтам.

Гэтая прылада ўяўляла з сябе дзве газавыя лямпы з чырвонымі і зялёнымі шкельцамі і дубліравала сігналы рэгуліроўшчыка ў цёмны час сутак.

Аднак гэты “цуд тэхнікі” адпрацаваў толькі чатыры тыдні, пасля чаго выбухнуў. У выніку выбуху загінуў паліцэйскі, і пра вынаходніцтва Найта на нейкі час забылі.

Толькі ў 1914 годзе на вуліцах амерыканскіх гарадоў Нью-Ёрка, Чыкага і Кліўленда з’явіліся электрычныя святлафоры, якія мелі чырвоны і зялёны сігналы. А ў 1918 годзе ў Нью-Ёрку быў уключаны першы трохколерны “рэгуліроўшчык”. У Расіі першы святлафор запрацаваў у Ленінградзе ў студзені 1930 г. У Беларусі першы святлафор з'явіўся на восем гадоў пазней у Мінску на скрыжаванні вуліц Кірава і Бабруйскай.

Заданні

1. **Як можна назваць тэкст?**
2. **Запоўніце табліцу дакладна/недакладна.**

| Сцверджанне | дакладна | недакладна |
|---|---|---|
| У др.п. 19 ст. узнікла неабходнасць ва ўладкаванні руху на дарогах | | |
| Першы святлафор адпрацаваў усяго 4 тыдні | | |
| У Беларусі 1-ы святлафор з’явіўся раней, чым у Расіі | | |
| Першыя электрычныя святлафоры мелі толькі чорны і зялёны сігналы | | |

3. **Устаўце прапушчаныя словы:**

1) У другой палове 19 стагоддзя на вуліцах гарадоў побач з аўтамабілямі можна было пабачыць ……………………………………………………………………..
2) Першы святлафор адпрацаваў нядоўга і …………………………………………….
3) Першы трохколерны святлафор быў усталяваны ў ……………………………….
4) Першы аўтаматычны святлафор семафорнага тыпу дуліраваў …………………… ў цёмны час сутак.

4. Размясціце часткі тэкусту ў правільным прадку.

| | |
|---|---|
| | Выбух святлафора |
| | З’яўленне электрычнага святлафора |
| | Дапамога новай прылады |

| | |
|---|---|
| | Усталяванне першага аўтаматычнага святлафора |
| | Першыя аўтамабілі – першыя праблемы на дарогах |

5. У Празе ёсць вельмі вузкая вулачка паміж дамамі, шырынёй усяго 70 см. У ёй цяжка размінуцца нават двум людзям. Таму тут усталявалі святлафор, які рэгулюе рух пешаходаў, што ідуць з розных бакоў вулачкі.

**Ці патрэбны святлафоры ў памяшканні нашай гімназіі (на паверхах, лесвіцах)? Чаму?**

6. Вядома, што часам святлафор замяняюць рэгуліроўшчыкам. Падумайце і запоўніце табліцу.

| |  |  |
|---|---|---|
| **Плюсы** | | |
| **Мінусы** | | |

***КРЭТЭРЫІ АЦЭНКІ***

Заданне 1

2б. – ёсць ключавое слова “святлафор”

1б. –агульная назва

0б. – іншы варыянт

Заданне 2

| | дакладна | недакладна |
|---|---|---|
| | + | |
| | + | |
| | | + |
| | + | |

2б. – усе адказы верныя

1б. – 2-3 правільныя адказы

0б. – іншыя адказы

Заданне 3

1) Конныя экіпажы
2) Выбухнуў
3) У 1918 г. у Нью-Ёрку
4) Рэгуліроўшчыка

2б. –усе правільна

1б. – 2-3 правільныя адказы

0б. – іншы варыянт

Заданне 4

**4,5,2,3,1**
2б. – усё правільна
1б.- 3 варыянты верныя
0б. – іншыя адказы

<u>Заданне 5</u>
2б. –вучань прыводзіць уласныя аргументы, абапіраючыся на тэкст
1б. – вучань разважае над пытаннем, не спасылаючыся на тэкст
0б.- дэманструе неразуменне матэрыялу

<u>Заданне 6</u>
2б. –вучань прыводзіць уласныя аргументы, абапіраючыся на тэкст
1б. – вучань разважае над пытаннем, не спасылаючыся на тэкст
0б.- дэманструе неразуменне матэрыялу